# Актуальныя даследаванні сталінізма ў Беларусі

**Дыскусія**
**22 кастрычніка 2021 г.**
**а 15:15-16:45 (беларускі час)**



Майстэрня Заіра Азгура , Мінск
Фота: А. Гужалоўскі

Дыскусія адбудзецца на беларускай і нямецкай мовах з сінхронным перакладам.

Якую ролю граюць паказальныя суды ў сельскай гаспадарцы ў агульным патоку рэпрэсій 1937-1939 гг. ў СССР? Якой была спецыфіка і асаблівасць культа Сталіна ў асобных савецкіх рэспубліках, прынамсі ў БССР? У сваіх актуальных даследаваннях беларускія гісторыкі звяртаюцца да розных аспектаў сталінізма.

У фокусе даследавання Ірыны Раманавай – паказальныя суды над кіраўнікамі сельскай гаспадаркі, якія ішлі адначасова з масавымі аперацыямі НКВД, але мелі ўласную логіку і свой сцэнар. Падставай для арганізацыі першага з іх паслужыў масавы сабатаж перапісу насельніцтва тымі, каго ўлады назавуць «маўчальнікі-краснадраконаўцы» ў асобна ўзятым беларускім раёне, які праславіўся такім чынам на ўвесь СССР. Што за ідэалогія стаяла за масавым супраціваам? Якое месца займалі паказальныя суды ў агульным шквале рэпрэсій 1937-1939 гг.? І, нарэшце, якая паміж імі сувязь?

Даследаванне гісторыка Аляксандра Гужалоўскага прысвечана культу Сталіна ў Савецкай Беларусі, які дасягнуў апагею ў канцы 1940-х - пачатку 1950-х гг. Ці быў культ Сталіна рэлігійным культам? Якім чынам ён паспрыяў легітымацыі савецкай улады ў Беларусі? Як ствараліся сталінскія міфы пра «творцу беларускай дзяржаўнасці», «аб'яднальніка беларускага народа», нарэшце, «вызваліцеля беларускага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў»? Як культ правадыра паўплываў на беларускае савецкае грамадства і якія меў наступствы?

**Выступоўцы:**

**Ірына Раманава,** Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (Вільня) / Універсітэт Гісэна
**Аляксандр Гужалоўскі,** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**Каментар:**
**Імо Рэбічак,** Універсітэт Ены

**Мадэрацыя і ўводнае слова:**
**Томас Бон,** Універсітэт Гісэна, гістарычны інстытут

DGO
Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

JUSTUS-LIEBIG-UNIVERSITÄT GIESSEN

Для ўдзелу ў дыскусіі запоўніце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы:
https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_DGUiTmp1SiCkqX6f-6xfjQ